Репозиторий ВГУ

**Юргевіч Н.К.**

# АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТУРНАГА АДНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў 1944–1955 гг.

Вялікая Айчынная вайна і нямецкая акупацыя пакінулі значны след у гісторыі Беларусі. Умовы, у якіх адбывалася аднаўленне краіны, былі дастаткова складанымі, асабліва для беларускай вёскі, якая падымалася з руін і папялішчаў. 9200 вёсак было спалена, у якіх было знішчана 1200 тыс. будынкаў, 209 гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу было разбурана, каласальнымі былі матэрыяльныя страты і пакуты людзей. Кожная сям'я недалічылася родных ці блізкіх. Насельніцтва Беларусі пасля вайны скарацілася на адну трэць: з 9,2 млн у 1941 г. да 6,2 млн у 1945 г. І пасля вызвалення ў неба нашай краіны пранікалі варожыя бамбардзіроўшчыкі, несучы смерць і разбурэнні. Так, у ноч на 14 і 18 чэрвеня 1944 г. бамбілі Гомель, у ноч на 21 і 23 ліпеня гэтага ж года – Мінск [6, с. 60–61]. На палях, у лясах і балотах засталіся неразарваўшыеся бомбы і міны, многія будынкі, дарогі і масты былі замініраванымі. Праца па абясшкоджванні выбуховых сродкаў праводзілася па меры неабходнасці, а таксама пасля вызвалення Беларусі.

Значныя страты ў гады вайны панеслі беларуская прамысловасць, сельская гаспадарка, культура. Акупанты разбурылі 6808 школьных будынкаў, разрабавалі 5144 установы, у тым ліку інстытуты, навукова-даследчыя цэнтры, Акадэмію навук, музеі, тэатры, клубы і бібліятэкі. Аднаўленчыя работы ў беларускай вёсцы разгортваліся адразу пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У пасляваенныя гады вялікі ўклад ў справу аднаўлення народнай гаспадаркі краіны ўнеслі працоўныя і сяляне, рабочыя і інтэлігенцыя, падлеткі і моладзь. Аднак умовы, у якіх гэтыя працэсы адбываліся, былі не такія простыя.

Значныя матэрыяльныя і людскія страты, асабліва ва ўсходніх абласцях рэспублікі, замаруджвалі працэсы культурнага будаўніцтва беларускай вёскі. Толькі ў Бягомльскім і Плешчаніцкім раёнах Мінскай, Лельчыцкім і Капаткевіцкім Палескай, Асвейскім, Суражскім і

Лёзненскім раёнах Віцебскай абласцей БССР акупанты знішчылі ў сельскай мясцовасці ўсе набыткі даваеннага будаўніцтва.

Смерць сеяла і застаўшаяся ад акупацыі эпідэмія сыпнога тыфу. Амаль усе раёны Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей зімой 1943–1944 гг. былі ахопленны эпідэміяй. У перыяд вызвалення Беларусі немцы спецыяльна зганялі здаровае і хворае насельніцтва з вёсак і пасёлкаў, якія знаходзіліся блізка ля лініі фронту, дзеля стварэння заслоны з мэтай перашкодзіць наступленне салдат і воінаў Чырвонай Арміі ў 1943–1944 гг. Ваеннае кіраўніцва вымушана было спецыяльна выдзяляць асобныя часці для дапамогі хворым людзям, адпускалі медыкаменты, аддавалі распараджэнні дактарам і медыцынскім сёстрам па правядзенні дэзінфекцыі і лячэнні людзей. 1 лютага 1944 г. П.К. Панамарэнка накіраваў В.М. Молатаву і Г.М. Малянкову ліст, у якім паведамлялася пра выяўленых у вызваленых раёнах у снежні 1943 г. 4911, а ў студзені 1944 г. 9745 сыпнатыфозных хворых (не поўныя дадзеныя). Толькі за чатыры месяцы 1944 г. праз шпіталі рэспублікі прайшло 47730 такіх хворых (з іх у Палескай вобласці былі зарэгістраваны 21130 выпадкаў захворвання, у Гомельскай – 16557) [6, с. 41–45].

Паміж краінамі антыгітлераўскай кааліцыі вяліся перамовы аб пасляваенным пераўладкаванні свету. На Тэгеранскай канферэнцыі (28 лістапада – 1 снежня 1943 г.) кіраўнікі саюзных дзяржаў вырашылі, што дзяржаўная мяжа паміж СССР і Польшчай будзе праходзіць у асноўным па “лініі Керзана”. Удзельнікі канферэнцыі дасягнулі згоды і па пытанні аб перасяленні савецкіх і польскіх грамадзян у адпаведнасці з “лініяй Керзана”. У верасні 1944 г. у адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі, а таксама дагаворамі паміж беларускім і польскім кіраўніцтвамі пачалася праца савецкай і польскай камісій па перасяленні грамадзян Беларусі з Польшчы ў Беларусь і польскіх грамадзян з Беларусі ў Польшчу. Аднак канчаткова гэтае пытанне было вырашана ў 1945 г. Па стану на 1 мая 1945 г. з Польшчы ў БССР было эвакуіравана 6788 гаспадарак (у іх 25123 члена сямей) з жадаючых 9050 гаспадарак (34868 чалавек). А з БССР у Польшчу было накіравана 12711 гаспадарак (5704 членаў сямей) з 79732 жадаючых (264937 чалавек) [7, с. 162]. Згодна пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б “О проведении эвакуации белорусского населения с территории Польши в БССР и польских граждан с территории БССР в Польшу” старшыні аблвыканкамаў і сакратары абкамаў партыі павінны былі перасяліць прыбыўшых у БССР згодна жаданню людзей: альбо ў калгаснай гаспадарцы, альбо надзяліць зямлёй для вядзення адзінаасобнай гаспадаркі ў памерах не вышэй 15 га на адну гаспадарку. У 1944–1945 гг. перасяленцы павінны былі карыстацца ільготамі: эвакуіраваныя грамадзяне вызваляліся ад усіх дзяржаўных грашовых падаткаў, ім выдаваліся крэдыты на суму каля 5 тыс. руб. на адну гаспадарку з пазыкай на 5 гадоў і г.д. Польскім грамадзянам, якія ад’язджалі з БССР у Польшчу, павінна былі выдаць кампенсацыю за рухомую і нерухомую маёмасць, яны вызваляліся ад некаторых падаткаў, праходжання воінскага абавязку і інш. [6, с. 188–189]. Аналіз дакументаў пацвярджае, што выехала з БССР у Польшчу палякаў і беларусаў-каталікаў больш, чым прыехала ў рэспубліку з Польшчы.

У гэты ж час дзяржаўныя органы прымалі меры для барацьбы з узброеным супраціўленнем нелегальных груп і арганізацый на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі [6, с. 230–231], якія часта перашкаджалі праводзіць савецкія мерапрыемствы ў беларускай вёсцы, пагражалі актывістам расправай і нават забойствам. Ды і насельніцтва заходнебеларускай вёскі даволі насцярожана адносілася да мерапрыемстваў савецкай улады, у прыватнасці, да стварэння калгасаў і саўгасаў.

У пасляваенныя гады кіраўніцтва рэспублікі надавала вялікае значэнне ў вёсцы будаўніцтву культурных і адукацыйных устаноў, якія павінны былі дапамагчы вырашыць у першую чаргу галоўную праблему – аднавіць народную гаспадарку БССР і сельскую гаспадарку ў прыватнасці. Самаадданая праца сельскіх жыхароў і інтэлігенцыі ў вобласці культурнага аднаўлення вёскі прынесла значныя вынікі. Дзяржаўныя асігнаванні, ініцыятыўнае будаўніцтва, сацыялістычнае спаборніцтва спрыялі ўзвядзенню ў многіх раёнах будынкаў для адукацыйных і культурна-асветных устаноў, колькасць якіх з кожным годам павялічвалася. Толькі з 1946 па 1955 гг. метадам народнай будоўлі ў беларускай вёсцы было адноўлена 4356 школ на 377 тыс. вучнёўскіх месцаў, што дазволіла кіраўніцтву многіх раёнаў поўнасцю вывесці сельскія школы з наёмных памяшканняў. Да канца чацвёртай пяцігодкі колькасць культурных і адукацыйных устаноў пераўзышла даваенныя паказчыкі.



Рэпазіторый ВДУ

Аднаўленчыя працэсы па-рознаму праходзілі ў заходне- і ўсходнебеларускай вёсках. Ва ўсходнебеларускай вёсцы з прычыны значных разбурэнняў культурныя ўстановы аднаўляліся з большай складанасцю. Шырока выкарыстоўвалася ініцыятыўнае будаўніцтва намаганнямі калгасаў і сялян. У заходнебеларускай вёсцы, дзе ўзровень разбурэнняў быў меншым, узвядзенне і рамонт будынкаў адбываліся больш хуткімі тэмпамі, прычым матэрыяльная база ўстаноў адукацыі і ўстаноў культуры часткова ўмацоўвалася праз перадачу жылля грамадзян, якія эмігрыравалі ў Польшчу. Аднаўленню школ і культурных устаноў тут таксама садзейнічаў метад народнай будоўлі, а па меры калектывізацыі заходніх абласцей значную ролю адыгралі сродкі і дапамога калгасаў і саўгасаў.

Заходнебеларуская вёска захоўвала і пасля вайны сваё традыцыйнае жыццё. Многія мерапрыемствы, якія восенню 1939 г. толькі ўводзіліся на далучаных да БССР землях, перарвала Вялікая Айчынная вайна. Вялікі ўплыў на жыццё сялян аказваў касцёл і польскія традыцыі. Таму складанасці развіцця школы і культурных устаноў у заходнебеларускай вёсцы былі звязаны з неабходнасцю надання сістэме адукацыі і культурна-асветнай рабоце характэрных рысаў савецкай сацыялістычнай культуры. Канешне, усё новае хутчэй успрымала сельская моладзь. У заходніх абласцях рэспублікі культурна-асветныя ўстановы дапамагалі мясцовым органам пры правядзенні калектывізацыі і антырэлігійнай прапагандзе. Аднак, заходнебеларуская вёска вельмі павольна прыстасоўвалася да перамен і захоўвала першапачатковы кансерватыўна-патрыярхальны характар.

Асаблівасцю культурнага аднаўлення заходнебеларускай вёскі стала беларусізацыя школ. Гэтае мерапрыемства было звязана ў большасці з пераводам польскіх школ на беларуска- і рускамоўнае навучанне, што выклікала незадавальненне часткі насельніцтва (польскага). Агульнымі рысамі ўсходне- і заходнебеларускай вёскі з'яўляліся складанае матэрыяльнае становішча, недахоп фінансавання і неабходных кадраў і спецыялістаў.

У пасляваенныя гады органы народнай адукацыі займаліся выяўленнем дзяцей школьнага ўзросту, якія павінны былі наведваць адукацыйную ўстанову. Многія дзеці на пачатку восені былі занятыя на сельскагаспадарчых работах. Так, у пачатку 1950–1951 навучальнага года ў Гродзенскай вобласці з'явілася на 9407 вучняў менш, чым меркавалася [2, арк. 39]. У сельскай мясцовасці Гомельскай вобласці не прыйшлі вучыцца ў гэтым годзе 14860 чалавек ці 13% (усяго было ўлічана 114378 вучняў) [1, арк. 50]. Мела месца і адваротная сітуацыя, калі падворны ўлік сельскіх дзяцей у летнія месяцы не праводзіўся, а ў пачатку навучальнага года ў школу прыходзіла вучняў больш, чым разлічвала кіраўніцтва. У пасляваенныя гады дзіцячая праца часцей выкарыстоўвалася больш заможнымі сем'ямі, асабліва ў заходніх абласцях, куды на заробкі прыязджалі сяляне і дзеці з усходніх абласцей БССР. У 1946 г. у Відзскім раёне Полацкай вобласці значная частка дзяцей не наведвала школу, таму што іх бацькі былі звязаны дагаворамі з прыватнымі асобамі па выпасу жывёлы [3, арк. 86]. З гэтай прычыны не наведвалі школу ў 1946–1947 навучальным годзе 1204 чалавекі ў Маладзечанскай, 513 – у Баранавіцкай, 1110 – у Гродзенскай абласцях [5, арк. 242]. Стварэнне фондаў усенавуча як аднаго з мерапрыемстваў па прыцягненні і замацаванні колькаснага складу вучняў спрыяла паспяховаму выкананню закона аб усенавучы ў беларускай вёсцы і падтрымцы дзяцей з бедных сем'яў. Нягледзячы на цяжкасці пасляваенных гадоў, колькасць дзяцей у сельскіх агульнаадукацыйных школах штогод павялічвалася: калі ў 1940–1941 гг. вучылася 1332,4 тыс. дзяцей, у 1945–1946 гг. 1122,6 тыс. вучняў, то ў 1950–1951 гг. – 1172,1 тыс., у 1955–1956 гг. – 879,6 тыс. дзяцей [4, с. 409]. Аднак у першыя пасляваенныя гады частка дзяцей заставалася па-за школай, захоўваўся і адсеў вучняў.

Такім чынам, хутка адноўленыя пасля вайны сельскія ўстановы адукацыі і культуры вельмі слаба развіваліся ў канцы 1940-х – сярэдзіне 1950-х гг. з прычыны недастатковага фінансавання, недахопу і нізкага кваліфікацыйнага ўзроўню кадраў, асабліва ў заходніх абласцях БССР. Мясцовыя ўлады выконвалі дзяржаўныя пастановы аб замацаванні кадраў у беларускай вёсцы праз адміністрацыйныя і гаспадарчыя меры. Але часта няўважлівыя адносіны да праблем сельскай інтэлігенцыі ў пасляваенныя гады (размеркаванне прадуктовых картак і талонаў сярод іншых асоб, немагчымасць іх атаварыць у магазінах, затрымка заработнай платы, недахоп жылля, газы, паліва) выклікалі зменнасць сярод настаўнікаў і работнікаў культуры і ўладкаванне іх у іншыя арганізацыі.



Рэпазіторый ВГУ

Агульнае цяжкае становішча вёскі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе сказвалася на становішчы і ўзроўні развіцця культуры, якая была неад’емнай часткай усёй савецкай сістэмы.

Литература


1. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці. – Фонд 144. – Воп. 42. – Спр. 69.
2. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гродзенскай вобласці. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 2310.
3. Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. – Фонд 141. – Воп. 1. – Спр. 50.
4. Народное хозяйство БССР: стат. сб. / пад ред. П. Голубцова. – Минск, 1963. – 511 с.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 4. – Воп. 17. – Спр. 52.
6. Освобожденная Беларусь: документы и материалы. В 2 кн. / НАРБ; сост.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2004. – Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944. – 398 с.
7. Освобожденная Беларусь: документы и материал. В 2 кн. / сост.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: НАРБ, 2005. – Кн. 2. Январь – декабрь 1945. – 506 с.


Репозиторий ВГУ